Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Сярэдняя школа №1 г.п. Рось”
Ваўкавыскага раёна
Гродзенскай вобласці

Конкурс даследчых работ
“Мая радзіма вялікіх людзей”
(намінацыя “Постаці слаўныя краю майго”)

# Інтэрв’ю
# “Музыка душы”

Аўтары: Бучылка Таццяна Аляксандраўна (X клас),
Халдзі Сабрын Алааеўна (X клас).
Кіраўнік: Польцына Алена Мікалаеўна, настаўнік
беларускай мовы і літаратуры.
т. +375(29)2850135

2019 г.

Творчы калектыў “Скарбонка” ўжо на працягу не аднаго дзесяцігоддзя прыносіць радасны настрой і задавальненне сваім слухачам. Выступленні гэтага ансамбля суправаджаюць усе значымыя святы нашага пасёлка Рось. Слухачы заўсёды вельмі цёпла сустракаюць гэтых самадзейных артыстаў. Нягледзячы на сталы ўзрост удзельнікаў, іх выступленні вельмі падабаюцца слухачам розных ўзростаў. Яны сваім прафесійным майстэрствам, душэўнасцю і ўнутраным запалам захапляюць аўдыторыю.

Ганіна Святлана Міхайлаўна — кіраўнік клуба аматараў народнай творчасці з 2006 года, прафесіянал сваёй справы, аддасны душой гэтай творчай прафесіі чалавек. Калектыў за гэтыя гады стаў для яе не толькі работай, але і часткай жыцця.

**— Раскажыце, калі ласка, гісторыю стварэння калектыву.**

— Ансамбль быў створаны яшчэ да таго, як я прыйшла працаваць у Роскі ДК. Гэта адбылося ў 2003 годзе. У прошлым годзе мы адзначылі 15-гадовы юбілей.

**— Як прыйшла ідэя назваць ансамбль “Скарбонка”?**

— Ідэя так назваць наш самадзейны калектыў выспявала паступова. Калі мы сталі выступаць на сцэне рэгулярна і канчаткова, склаўся стыль ансамбля, рэпертуар, то стала відавочна, што былая назва не вельмі адлюстроўвае агульную тэндэнцыю нашай творчасці. Доўга думалі, радзіліся і, як часта гэта бывае, раптоўна на адной з рэпетыцый камусьці з удзельнікаў прыйшла такая ідэя. Назва адразу ўсім спадабалася, таму што народныя песні, якія мы выконваем, гэта скарбніца нашага беларускага народа. А адной з асноўных задач калектыву з’яўляецца захаванне культурнай спадчыны беларусаў.

**— Значыць, калектыў не заўсёды меў такую назву?**

— Так. У розны час называўся па-рознаму: “Родничок” і “Ветэран”. Таму што спачатку гэты клуб аб’ядноўваў пенсіянераў Роскага пасялковага савета. Яны знаходзілі сабе заняткі па інтарэсах, праводзілі сумесныя святы, разам бавілі вольны час.

**— А каму прыйшла задума стварыць такое аб’яднанне?**

— Першапачатковa ідэя аб’яднання ветэранаў працы на базе нашага ДК належала быламу старшыні пасялковага савета Данільчык Сабіне Францаўне. Потым яе падтрымалі работнікі Дома культуры. Такі пачын аказаўся вельмі ўдалым.

**— Якімі шляхамі ў клуб прыходзяць удзельнікі ансамбля?**

— На той момант, калі я пачала працаваць у гэтым калектыве, то многія ўдзельнікі ўжо былі ў яго складзе . Гэта старажылы ансамбля. З адной з салістак ансамбля, Цвятковай Г.М., я пазнаёмілася, калі дапамагала рыхтаваць праграму на агляд-конкурс устаноў аховы здароўя. Пасля гэтага конкурсу яна і прыйшла ў калектыў. Ды не адна, а прывяла з сабой сяброўку Парай В.І. А сямейная пара Рошчупкіных Аляксандры Іванаўны і Сяргея Пятровіча прыехала жыць у наш пасёлак у 90-х гадах. Гэта былыя настаўнікі, вельмі творчыя людзі. Сяргей Пятровіч віртуозна іграе на баяне, а Аляксандра Іванаўна — на балалайцы. Яны аднойчы ўбачылі наша выступленне і самыя прыйшлі ў клуб.

Усе людзі ў нашым калектыве — гэта людзі з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, якія не хочуць сустракаць старасць ў адзіноце, бяздзейнасці.

**— На якіх яшчэ музычных інструментах іграюць удзельнікі калектыву?**

— Кожны іграе на якім-небудзь інструменце. У асноўным — гэта шумавыя: лыжкі, бубен, трашчоткі…

**— Ці бывала, што людзі па нейкіх прычынах пакідалі ансамбль?**

— Так, на жаль, гэта іншы раз здараецца. І прычына адна: цяжкі стан здароўя. У нас жа ўсе ўдзельнікі пенсійнага ўзросту. Самаму старэйшаму 79 год.

**— Раскажыце, як падбіраецца ваш рэпертуар?**

— Наша назва гаворыць сама за сябе. Рэпертуар складаецца з беларускіх народных песень, частушак, прыпевак. Ёсць у нашым рэпертуары нямала народных песень, якія ўдзельнікам ансамбля перадалі ў спадчыну іх маці, бабулі, якія спявалі ў іх родных вёсках. Я, як кіраўнік ансамбля, стараюся падбіраць таксама цікавы матэрыял.

**— Як часта даводзіцца вам выступаць?**

— Выступаем мы вельмі часта. Нас запрашаюць на розныя святы горада, раёна, пасёлка. Удзельнічаем мы ў раённых і абласных фестывалях, аглядах-конкурсах.

**— Якія найбольш значымыя вашы дасягненні?**

— У нас шмат розных дыпломаў і ўзнагарод. З апошніх — гэта II месца ў раённым фестывалі-конкурсе “Узрост. Майстэрства. Талент”. Наогул, вяртаючыся з кожнага конкурсу, мы абавязкова прывозім дыпломы ці ганаровыя граматы. Гэта сведчыць аб высокім майстэрстве і прафесіяналізме калектыву.

**— Ці склаліся традыцыі за пятнаццаць год існавання калектыву?**

— Канешне склаліся. Члены нашага клуба любяць праводзіць вольны час разам. Гэта і сумесныя выезды на прыроду, і пасядзелкі ва ўтульнай атмасферы за кубачкам чаю. Таму што мы ўжо сталі адной сям’ёй, дзе кожнаму ўтульна. А яшчэ адной добрай традыцыяй сталі выезды ў санаторый “Пралеска” са сваёй праграмай “Вячоркі”. Гледачам вельмі падабаецца. Нават, ведаеце, ёсць нямала моладзі, якую цікавіць наша творчасць. Гэта асабліва прыемна.

**— Раскажыце, калі ласка, пра свае творчыя планы.**

— У нашых бліжэйшых планах атрымаць званне “Народны калектыў”. Далёка не забягаем, бо ўсе людзі ва ўзросце. Падбіраем і вучым новы рэпертуар. Хацелася б абнавіць касцюмы ансамбля…

**— Дарэчы, дзе вы бераце канцэртныя касцюмы?**

— Касцюмы мы падбіраем у касцюмернай Роскага ДК. Іншы раз дапаўняем іх сваімі дэталямі, прыдумваем розныя варыяцыі вобразаў.

— Дзякуем Вам, Святлана Міхайлаўна, за шчырыя адказы. Хочацца пажадаць вашаму калектыву доўгага творчага жыцця, натхнення, плёну ў працы і здзяйснення ўсіх мар!

Дадатак




Клуб аматараў народнай творчасці “Скарбонка”



Выступлненне на свяце Купалля ў в. Плябанаўцы



Семінар у цэнтры моладзі “Дэльта”, г. Ваўкавыск



На свяце вёскі Лазы



“Дажынкі — 2018”



“Эх, Калядачкі!..”



За кубачкам чаю



Няхай спявае душа!